# «ГЭТА ГОНАР!» ПРЭЗІДЭНТ — АБ ДАСЯГНЕННЯХ

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка наведваў Мотавелазавод, які са стварэннем на яго тэрыторыі Мінскага гарадскога тэхнапарка набыў новае дыханне. А ў аўторак Прэзідэнт прыехаў на Мінскі аўтамабільны завод, у гісторыі якога сёлета таксама пачалася новая старонка. На МАЗе створана новая аўтобусная вытворчасць. Але толькі гэтай тэмай візіт Прэзідэнта не абмежаваўся.



Фота БелТА.

## «ГЭТА РЭКЛАМА НЕ ТОЛЬКІ АЎТАЗАВОДУ, АЛЕ І ЎСЁЙ КРАІНЕ»

Найперш кіраўнік дзяржавы сустрэўся з тымі, хто робіць брэнд МАЗ знакамітым на ўвесь свет — з камандай «МАЗ-СПОРТаўта». З моманту свайго стварэння ў 2010 годзе каманда ўдзельнічала ў 54 міжнародных і рэспубліканскіх гонках, у 34 з іх станавілася прызёрам ці пераможцам. У 2023 годзе «МАЗ-СПОРТаўта» выйграла ўсе гонкі, у якіх удзельнічала. Як адзначыў кіраўнік каманды Сяргей Вязовіч, гэта быў пік іх формы. У 2024 годзе каманда крыху здала свае пазіцыі — у асноўным займала другія ці трэція месцы. «Калі будзеце перамагаць? Чым больш увагі, тым меншы вынік», — заўважыў Прэзідэнт. Сяргей Вязовіч адказаў, што ў спорце заставацца на піку пастаянна вельмі складана. «Мы моцна перааснасцілі нашу тэхнічную базу. Гэта таксама немалаважна», — заўважыў ён. Сяргей Вязовіч адзначыў, што распрацоўваюцца новыя стратэгіі падрыхтоўкі, бо пад старыя сапернікі ўжо падстроіліся.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў свой час па яго даручэнні звярнулі ўвагу на каманду і на тое, што было неабходна для яе развіцця. Адпаведнае даручэнне было дадзена міністру прамысловасці. «Я яму сказаў: «Будзеш капітанам гэтай каманды. Што хочаш рабі, але дапамагай хлопцам!» — прыгадаў Прэзідэнт. Цяпер Мінпрам узначальвае Аляксандр Яфімаў, якому кіраўнік дзяржавы даручыў курыраваць гэта пытанне. «Малады хлопец, беларус сапраўдны. Вось табе новы капітан. Павінен дапамагаць. Нам трэба ўдзяліць неабходную ўвагу. Калі нешта трэба, скажы», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да Сяргея Вязовіча.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, з чым звязана такая ўвага да спартыўнай каманды: «Калі на міжнародных экранах ва ўсім свеце МАЗ — усе пачынаюць думаць: а што гэта за завод, які «забівае» ўсіх на трасе? Гэта — наш МАЗ, наш гонар. Гэта рэклама. І рэклама не толькі аўтазаводу, але і ўсёй краіне, і ўсёй аўтамабілебудаўнічай галіне Беларусі. Вось у чым мой інтарэс». Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што каманда павінна падрыхтаваць сабе годную замену. Аляксандр Яфімаў падкрэсліў, што такая задача стаіць і ў найбліжэйшыя тры гады будуць падрыхтаваны два-тры экіпажы, якія будуць дыхаць у спіну «МАЗ-СПОРТаўта».

## «ПЕРАМАГАЙЦЕ — ПАДТРЫМКА БУДЗЕ!»

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што змена пакаленняў часта становіцца вялікай праблемай для многіх відаў спорту.

> **«Таму трэба рыхтаваць змену, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. — Я цяпер увесь час кажу пра змену пакаленняў. Наступная наша з вамі пяцігодка — каб нашых дзяцей падняць, каб яны краіну ўзялі і панеслі далей. Вось наша з вамі задача».**

Па словах кіраўніка дзяржавы, важна, каб сыходзячае пакаленне не сапсавала жыццё будучаму.

Прэзідэнту паказалі імправізаваны бівак — месца размяшчэння каманды ў пустыні падчас гонак. МАЗ вырабляе аўтадамы, у якіх жывуць экіпажы. У такіх машынах створаны ўсе ўмовы, каб экіпажу і камандзе было зручна: каюты, душ, кухня, гарачая вада. Не курорт, але ў пустыні камфортна. Аляксандр Лукашэнка агледзеў размяшчэнне каманды і азнаёміўся з тэхнікай. Сяргей Вязовіч і члены каманды падрабязна расказалі пра нюансы камплектацыі і абслугоўвання гоначных аўтамабіляў — усё прадумана да дробязяў. У камандзе працуе шэсць канструктараў, якія прыслухоўваюцца да досведу членаў экіпажа і ўлічваюць іх пры праектаванні новых мадэляў. Важны момант — у гоначных грузавіках выкарыстоўваецца шмат дэталяў і вузлоў, якія ёсць і на штатных серыйных аўтамабілях. Умовы, праз якія праходзяць аўтамабілі, перагрузкі, якія яны вытрымліваюць, паказваюць усе перавагі і недахопы дэталяў і вузлоў, што вельмі важна для вытворчасці. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што члены экіпажа, якія правяралі машыны ў самых розных умовах, павінны актыўна супрацоўнічаць з канструктарамі завода, падказваць ім, даваць парады. Генеральны дырэктар МАЗа Валерый Іванковіч адзначыў, што такое ўзаемадзеянне наладжана, члены каманды «МАЗ-СПОРТаўта» задзейнічаны ва ўсіх вытворчых працэсах, удзельнічаюць у розных сацыяльных і масавых мерапрыемствах.

Аляксандр Лукашэнка настолькі зацікавіўся, што захацеў асабіста правесці тэст-драйв спартыўнага МАЗа: «Я гляджу на ваш аўтамабіль. Цікава было б праехаць дзенебудзь у кар'еры». — «Як толькі будзем гатовы, дадзім знаць», — адказаў Сяргей Вязовіч.



Фота БелТА.

Прэзідэнт паабяцаў, што камандзе «МАЗ-СПОРТаўта» будзе аказана ўсялякая падтрымка, будуць створаны ўсе ўмовы. Пры адной абавязковай — калі будзе вынік і перамогі. У час наведвання размяшчэння каманды «МАЗ-СПОРТаўта» Прэзідэнту таксама падарылі камандную форму і папрасілі пакінуць аўтограф на фотаздымках, адзін з якіх застанецца на памяць камандзе, а другі стане экспанатам у музеі Палаца Незалежнасці.

## «НЯДРЭННА Ж ПАБУДАВАЛІ. УМЕЮЦЬ»

У 2023 годзе МАЗ пачаў рэалізацыю інавацыйнага праекта па рэканструкцыі аўтобуснага завода з будаўніцтвам новага вытворчага корпуса і павелічэннем вытворчых магутнасцяў да трох тысяч адзінак тэхнікі за год. Праектам прадугледжана стварэнне трох аўтаномных ліній па вытворчасці пасажырскай тэхнікі, будаўніцтва боксаў для дыягностыкі, наладкі і здачы аўтобусаў, арганізацыя спецыялізаванага зварачна-нарыхтоўча-механічнага цэха, стварэнне складской гаспадаркі. Увесці ў эксплуатацыю аўтобусны завод плануецца да красавіка 2025 года. Чакаецца, што гэта дасць магчымасць удвая павялічыць магутнасці МАЗа па вытворчасці пасажырскай тэхнікі, забяспечыць развіццё яе новага сямейства, нарасціць экспартны патэнцыял да 1,5 тысячы адзінак у год і стварыць 331 новае высокатэхналагічнае і высокапрадукцыйнае працоўнае месца.

З новай вытворчасцю Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся асабіста. «Гэту пляцоўку мы пабудавалі з нуля за паўтара года. Усё абсталяванне ўстаноўлена, працуе, персанал набраны. Тут павінны працаваць 1223 чалавекі. Сёння 431 чалавека пераводзім з дзеючай вытворчасці, далей мы склалі графік: да канца года (1 студзеня 2026 года мы павінны будзем выйсці на стапрацэнтную загрузку дадзенага вытворчага комплексу) штат будзе ўкамплектаваны», — далажыў генеральны дырэктар МАЗа Валерый Іванковіч.

«Нядрэнна ж пабудавалі. Умеюць», — ацаніў вытворчую пляцоўку Прэзідэнт. Як расказаў Валерый Іванковіч, на гэтай пляцоўцы знаходзіцца ўвесь тэхналагічны працэс — ад першага элемента да гатовага аўтобуса. Да гэтага ў адным месцы рэзалі, у другім — зварвалі, у трэцім — збіралі. Пры нейкім форс-мажоры, збоі з камплектуючымі вырабы выцягвалі на вуліцу, незалежна ад умоў надвор'я, і зацягвалі назад. Не заўсёды гэта было зручна. «А цяпер мы будзем працаваць так, як усе сусветныя кампаніі. Гэта пляцоўка сусветнага ўзроўню. У нас тры падрыхтоўчыя лініі, і па іх мы можам весці адразу тры тыпы аўтобусаў. Тое, што ў нас тэхналагічна не атрымлівалася ў

Фота БелТА.





